Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 ВЕРАСНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №178 (28542)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Кангрэс беларускага кнігадрукавання

СТАР. 4



Школа выжывання для правінцыялаў

СТАР. 13



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

ЦЫТАТА ДНЯ



**Мар'яна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі:**

*«Кніга мае важнае значэнне для беларускага народа. Яна захоўвае мудрасць пакаленняў, аб'ядноўвае нас як нацыю, з'яўляецца дасягненнем духоўнай культуры народа. Сёння вялікая справа першадрукара Францыска Скарыны працягваецца на дастойным узроўні. На міжнародных кніжных выстаўках і конкурсах беларуская кніга прадстаўлена з гонарам і атрымлівае самыя высокія ўзнагароды».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.09.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9447 | ▲ |
| Еўра | 2,3145 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0337 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0743 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Цёплая восень сям'і Івановых



Шматдзетная маці Людміла ІВАНОВА з Целяхан Івацэвіцкага раёна далучае сваіх дочак і сыноў, а іх у сям'і Івановых акно шасцёра, да хатніх спраў змалку. Цяпер на агародзе шмат клопатаў — трэба збіраць ураджай бульбы, памідораў, цыбулі. Пакуль старэйшыя дзеці вучацца ў школе, малодшыя — Вера, Андрэй і Іван *(на фота)* ахвотна дапамагаюць любай матулі. Летась, за ўзорны прыклад у выхаванні дзяцей, Людміла Іванова была ўзнагароджана ордэнам Маці.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Захад-2017

## АДКАЗНЫ СТАРТ

### Рэгіянальная групоўка войскаў прыступіла да выканання вучэбна-баявых задач



Фота Надзеі БУЖАН.

**Учора беларускія і расійскія вайскоўцы распачалі сумеснае стратэгічнае вучэнне «Захад-2017». Карэспандэнты «Звязды» пабывалі на пункце кіравання рэгіянальнай групоўкі войскаў, дзе афіцыйна быў дадзены старт манёўрам.**

Ваеннаслужачыя, якія знаходзяцца ў зыходных раёнах вучэння, пачалі ажыццяўляць вучэбна-баявыя задачы згодна з тымі рашэннямі, якія былі адпрацаваны загадзя.

Як адзначыў **кіраўнік вучэння ад беларускага боку, начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Беларусі генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ,** пункты кіравання разгорнуты, сістэма кіравання створана і функцыянуе ў поўным аб'ёме.

Найбольш актыўныя дзеянні ў першы дзень вучэння разгарнуліся на ўчастку мясцовасці Дрэтунь, на палігонах Лепельскі і Лосвіда, што на Віцебшчыне. Там войскі на практыцы рэалізоўваюць алгарытм па пошуку, блакіраванні і знішчэнні незаконных узброеных фарміраванняў у глыбіні нашай краіны.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■ Сітуацыя

Як падманваюць пры арэндзе жылля

## КВАТЭРА З СЮРПРЫЗАМ

**Кожны, хто хоць раз сутыкаўся са здыманнем кватэры, ведае, што гэта справа, якая добра-такі вымотвае нервы. Тут — амаль як з пошукам спадарожніка жыцця, — каб усё склалася ўдала, відаць, па-асабліваму павінны сысціся зоркі. Мала таго, што знайсці сімпатычную кватэрку не за касмічную суму і так не проста, арэндадаўцы, а часам і абсалютна староннія людзі (сапраўды, і такое бывае!) спрабуюць нажыцца на гэтым працэсе па максімуме.**

### «ВЫ НАВАТ НЕ АДЧУЕЦЕ РОЗНІЦЫ!»

Возьмем хоць бы саму сістэму пошуку кватэры ў інтэрнэце. Здаецца, нават у часы аб'яў на слупах было прасцей. Дарэчы, некаторыя дагэтуль выкарыстоўваюць правераны спосаб, клеючы запіскі з нумарамі тэлефонаў накшталт «Мару зняць трохпакаёўку...» каля ўваходных дзвярэй у пад'ездзе. Магчыма, хочуць зэканоміць на выходных званках, але хутчэй за ўсё, проста не жадаюць нічога агульнага мець з рыэлтарскімі агенцтвамі.

Калі першы раз у пошукавым радку ўводзіш, напрыклад, «зняць кватэру ў Малінаўцы», пачынаеш радасна прадчуваць пераезд ужо на наступны дзень. Аб'яў, можа, і не так шмат, але сярод іх трапляюцца настолькі «саладкія», што здаецца, злавіў удачу за хвост. Але пачынаеш тэлефанаваць, а ў адказ — цішыня. Зноў і зноў пераглядаеш аб'яву на сайце, пакуль не заўважаеш, што да цябе гэта рабілі ўжо некалькі соцень разоў. Нестыковачка! Каб такую кватэру і не арандавалі. На самай справе здаваць кватэру з новым на выгляд рамонтам за ледзь не смешныя грошы вам ніхто не збіраецца — гэта прынада, каб вы зайшлі на той ці іншы сайт. Хітрасць непрыемная, але ў прынцыпе бясшкодная.

СТАР. 13

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ЛЯДОЎНЮ АБО ВЯНДЛЯРНЮ

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# КАЛІ ГРОШЫ ПРАЦУЮЦЬ НА ЛЮДЗЕЙ

## Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з кіраўніком ЕБРР

**Сацыяльна арыентаваны бізнес, інвестыцыі і сумесныя праекты — гэтыя пытанні былі абмеркаваны падчас сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і прэзідэнта Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця сэра Сумы Чакрабарці.**

### Мэта — эфектыўнасць

ЕБРР — банк не зусім звычайны. Яго мэта — праз унёскі ў эканамічны прагрэс і рэканструкцыю садзейнічаць пераходу да адкрытай эканомікі, а таксама да развіцця прыватнай і прадпрымальніцкай ініцыятывы ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Штогод банк абавязаны накіроўваць не менш за 60% рэсурсаў у недзяржаўны сектар краін аперацый. Сёння ЕБРР працуе ў 36 краінах, сярод якіх — Беларусь.

— За час работы з вашым банкам вы інвеставалі ў Беларусь каля двух мільярдаў долараў, — канстатаваў беларускі лідар, вітаючы замежнага госця. — Гэта вельмі вялікія грошы. Што радуе — я гэта вельмі высока цаню — гэтыя грошы працуюць напрамую на людзей.

Гаворачы аб працэсах прыватызацыі ў Беларусі, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: у нас вельмі акуратна падыходзяць да продажу дзяржаўных актываў.

— Тым не менш мы з вамі супрацоўнічаем — з кампаніяй, агенцтвам, якое перш за ўсё накіравана на эфектыўную прыватызацыю дзяржаўнай уласнасці, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Наша стрыманасць у прыватызацыі дзяржуласнасці і ваша галоўная задача — больш актыўная прыватызацыя, — як быццам бы такія супярэчлівыя працэсы... У жыцці яны ўзбагачаюць адно аднаго. Гэта значыць, мы вучымся многаму ў вас, у вас вялікі вопыт. Ну а вы, назапашваючы гэты вопыт, усё ж такі бачыце нейкае рацыянальнае зерне і ў беларускіх падыходах да продажу дзяржаўнай уласнасці. Аднак, я вельмі спадзяюся, што ў нас адна мэта — эфектыўнае выкарыстанне дзяржаўнай уласнасці, тых актываў, якія мае дзяржава.

### Трэнд для банка і дзяржавы

Яшчэ адзін, больш прыземлены кірунак супрацоўніцтва Беларусі і ЕБРР — непасрэднае крэдытаванне канкрэтных праектаў на тэрыторыі нашай дзяржавы.

— Адна з просьбаў, якую я хачу адрасаваць вам, — у трэндзе Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця, — адзначыў кіраўнік краіны, — гэта падтрымка малога і сярэдняга бізнесу. Мы зараз выключную ўвагу вырашылі ўдзяліць гэтаму кірунку ў развіцці эканомікі нашай краіны. Наступная пяцігодка будзе накіравана на тое, каб разняволіць ініцыятыву канкрэтных людзей, невялікіх калектываў, надаць большую дынаміку здольнасцям чалавека.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: у краіне забяспечаны стабільнасць, бяспека, кіруемасць. Таму дзяржава хоча даць ініцыятыўным людзям больш свабоды ў самарэалізацыі — перш за ўсё ў вытворчай сферы, сферы паслуг.

— Мы вельмі разлічвалі б на вашу падтрымку тут, — сказаў беларускі лідар.

### Інвестыцыі ў... кантынент

Больш глабальная праблема, што ўзнімалася падчас учарашніх перагавораў — інвестыцыі ў інфраструктуру, якая абслугоўвае не толькі Беларусь, але і ўсю еўрапейскую прастору:

— Так склалася, што Беларусь стала для еўрапейцаў і азіятаў найбольш прыцягальнай, стабільнай і бяспечнай тэрыторыяй, праз якую перамяшчаюцца людзі, тавары, грузы, паслугі... Сотні мільёнаў тон — толькі грузаў!.. Натуральна, нягледзячы на тое, што ў нас ндзрэнная інфраструктура і яна пакуль спраўляецца з гэтымі патокамі, трэба думаць пра тое, каб гэтая інфраструктура была на самым высокім еўрапейскім узроўні. Мы вам удзячныя, што вы інвесціруеце ў развіццё дарожнай сеткі, але гэтага недастаткова.

Прыклад таму — перагаворы па пракладцы шырокай магістралі па поўдні Беларусі:

— Каб паўднёвы паток — Кітая, Цэнтральнай Азіі, Расіі перахапіць і накіраваць праз поўдзень, праз Гомель на Брэст у Еўропу — у двух напрамках, — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. — Бо з Украінай — вы разумееце — пакуль ёсць пэўныя праблемы. Мы гатовы аказаць гэтую паслугу. Я ўсё гэта кажу, каб еўрапейцы, і вы таксама, разумелі, што даючы нам пэўную падтрымку, вы робіце дабро для нас. Але гэта двухбаковы працэс, і гэта карысна і для Еўропы ў тым ліку. Мы хочам, каб вы гэта ўлічвалі, калі мы вядзём перагаворы па тых ці іншых праектах.

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што ў наступным годзе мы ў асноўным скончым гродзенскую трасу, будаваць якую нам дапамагае ЕБРР.

— Да канца будучага года мы спакойна маглі б пракладваць магутнасці на будаўніцтва паўднёвага калідора, ён вельмі важны зараз для Еўропы, — паведаміў Прэзідэнт. — Мы гатовы пабудаваць дарогу танней, чым любая іншая еўрапейская ці азіяцкая кампанія — ці то ў асфальтавым, ці то ў бетонным варыянце. Ну і шэраг іншых праектаў — мы гатовы да абмеркавання, у тым ліку і па банкаўскім сектары — вядомыя пытанні, па якіх мы з вамі вядзём перамовы. І мы ўжо дастаткова прыстойна прасунуліся да канкрэтыкі.

Сума Чакрабарці, у сваю чаргу, канстатаваў, што за гэтыя гады адбыліся значныя станоўчыя змены ў адносінах паміж Беларуссю і ЕБРР. Цікавая інфармацыя: у найбліжэйшы час будзе весціся гаворка пра інвестыцыі банка ў розныя праекты ў нашай краіне ў суме да 200 мільёнаў еўра.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# Сур'ёзныя паўнамоцтвы і высокая адказнасць

## Кіраўнік дзяржавы зрабіў шэраг кадравых прызначэнняў

**Назначаныя кіраўнік міністэрства і дыпламат, узгодненыя старшыні шэрагу райвыканкамаў. Наказ Прэзідэнта — так працаваць на карысць родных рэгіёнаў, каб гэта адчувалася ў маштабах дзяржавы.**

***Кіраўнік дзяржавы прызначыў:***

ХУДЫКА Андрэя Паўлавіча — міністрам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя;

КАЛЕСНІКА Валерыя Георгіевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Інданезія і па сумяшчальніцтве ў Малайзіі, Рэспубліцы Сінгапур і Рэспубліцы Філіпіны;

АЛЕЙНІКА Сяргея Фёдаравіча — пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры Міжнароднай марской арганізацыі па сумяшчальніцтве;

***Прэзідэнт даў згоду на прызначэнне:***

ГАРБАЧОВА Андрэя Аляксеевіча — старшынёй Буда-Кашалёўскага райвыканкама;

БАЙКОВАЙ Веранікі Анатольеўны — старшынёй Лоеўскага райвыканкама;

ПАЛУЯНАВА Віктара Васільевіча — старшынёй Кастрычніцкага райвыканкама;

АЛЕЙНІКАВА Дзмітрыя Вадзімавіча — старшынёй Светлагорскага райвыканкама;

ДЗЕНГАЛЁВА Генадзя Іванавіча — старшынёй Барысаўскага райвыканкама;

КАРПОВІЧА Мікалая Мікалаевіча — старшынёй Старадарожскага райвыканкама;

КАЗЛОВА Віталя Мікалаевіча — старшынёй Чэрвеньскага райвыканкама;

БАЧКОВА Дзмітрыя Уладзіміравіча — старшынёй Крычаўскага райвыканкама;

МАТУСЕВІЧА Дзмітрыя Феафанавіча — намеснікам міністра эканомікі;

ШЧАРБАКОВА Сяргея Сяргеевіча — намеснікам старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях;

БОБЫРА Ігара Міхайлавіча — генеральным дырэктарам ААТ «Гродна Азот»;

АСТРЭЙКІ Аляксандра Вячаславіча — членам Брэсцкага аблвыканкама;

МУРАШКІНА Аляксандра Андрэевіча — членам Брэсцкага аблвыканкама.

Звяртаючыся да Веранікі Байковай, новапрызначанай старшыні Лоеўскага райвыканкама, Прэзідэнт звярнуў увагу, што гэты рэгіён вельмі прыгожы і што ён сам вельмі любіць гэты гарадок:

— Думаю, што ў мяне атрымаецца пабываць у Лоеве, і мы ўжо там канкрэтна абмяркуем некаторыя пытанні яго развіцця. Хоць у свой час мы нямала зрабілі для развіцця гэтага мястэчка. Гэта проста цудоўнае месца ў Беларусі, адно з найпрыгажэйшых.

Кіраўнік дзяржавы плануе пабываць — магчыма, нават сёлета — і ў Буда-Кашалёве, дзе таксама новы старшыня райвыканкама.

— Трэба горад прывесці ў нармальны выгляд і прынцыпова заняцца вытворчасцю, асабліва сельскай гаспадаркай, — упэўнены кіраўнік краіны. — Раён добры, але ён павінен быць не ў хвасце і нават не ў сярэдзіне.

У Светлагорску цяпер будуецца завод па вытворчасці сульфатнай беленай цэлюлозы. Новае прадпрыемства павінна адкрыцца ўжо 7 лістапада і, калі ўсё пойдзе як трэба, яно кардынальна зменіць жыццё ў горадзе. Натуральна, у лепшы бок.

— Гэта ў вас здыме ўсе праблемы, — звярнуўся Прэзідэнт да новага кіраўніка раёна Дзмітрыя Алейнікава. — Я, безумоўна, проста абавязаны прыехаць у гэты час, адкрыць гэтае прадпрыемства і паглядзець, як яно будзе працаваць.

Новы старшыня прыйдзе і ў Барысаўскі райвыканкам.

— Калі мы гэты раён з кален паднімем, Мінская вобласць атрымае новае дыханне, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Разумейце сваю адказнасць у сувязі з гэтым. Орша — гэта пілотны праект. Можа быць, таму што я лепш ведаю гэты рэгіён у цэлым і гэты рэгіён для нас найбольш складаны. Мы таму за яго ўзяліся. Паралельна даручана ўраду, усёй краіне заняцца Барысаўскім рэгіёнам, Баранавіцкім. Можа быць, Маладзечна... Прыйшоў час гэтымі рэгіёнамі займацца. Таму хацелася б, каб вы пачалі сваю работу з гэтага. Гэта, вядома, не Орша з тымі праблемамі, якія там ёсць, але і ў Барысаве іх нямала.

Чэрвеньскі і Крычаўскі раёны, дзе таксама прызначаны новыя старшыні райвыканкамаў, па словах кіраўніка дзяржавы, — вельмі важныя. Асабліва Крычаў, дзе высокі ўзровень прамысловасці. Чэрвень жа знаходзіцца блізка ад сталіцы.

— Людзі з задавальненнем едуць сюды (у Чэрвень. — ***Аўт.***), — канстатаваў Прэзідэнт. —Упэўнены, што прыток насельніцтва туды будзе ўзрастаць у сувязі з тым, што мы звужаем будаўніцтва жылля ў Мінску. Ды і людзі адчулі смак вёскі, прыроды... Гэта датычыцца і Барысава, і вас, і Смалявіч, і Смілавіч. Звярніце на гэта ўвагу: павінен быць парадак.

* * *

Звяртаючыся да ўсіх навапрызначаных старшынь райвыканкамаў, кіраўнік краіны падкрэсліў: патрабаванні да іх пастаянна ўзрастаюць.

— Так, мы будзем вас падтрымліваць, — сказаў беларускі лідар. — Вы бачыце таксама, што з гэтай уборкі вы ўсё больш і больш атрымліваеце правоў. Хацелася б, каб вы імі скарысталіся. Па-народнаму скажу, — вы не павінны працаваць з губернатарамі і з іншымі па прынцыпе «ён — кіраўнік, а вы — дурань». Гэтага быць не павінна. Вы фактычна людзі, прызначаныя Прэзідэнтам. Ніхто не можа вас ні адхіліць ад пасады, ні нейкімі іншымі пытаннямі займацца без дазволу Прэзідэнта. Гэта значыць, вы маеце салідныя індульгенцыі, салiднае прыкрыццё з боку Прэзідэнта.

У той час, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, і попыт з кіраўнікоў асобны. Ён заклікаў старшынь райвыканкамаў не быць маўклівымі выканаўцамі і нагадаў: ад таго, як яны будуць працаваць, залежыць дабрабыт дзяржавы ў цэлым.

Асобную ўвагу і асцярожнасць, па словах кіраўніка краіны, уладам трэба праяўляць у вырашэнні тых пытанняў, ад якіх напрамую залежаць лёсы людзей.

— Усе мы сёння начальнікі, а заўтра — простыя людзі. Сто працэнтаў — ад вас да Прэзідэнта — усе мы калісьці будзем простымі людзьмі. Трэба разумець і паважаць людзей, з якімі мы працуем. Але дысцыпліна і патрабаванне — гэта пытанне нумар адзін. Таму што гэтага ў нас у краіне як раз не хапае.

Выказаўся кіраўнік дзяржавы і наконт традыцыйнага «трыа» сацыялкі: занятасці, зарплат і цэн. Прэзідэнт падкрэсліў: патрабаванні Дэкрэта №3 ніхто не адмяняў, адпаведна на месцах трэба разабрацца — нікому дапамагчы з пошукам працы, іншага — проста прымусіць працаваць. Што да зарплат, то патрабаванне ранейшае: падняць сярэднюю зарплату па краіне да ўзроўню 1000 рублёў. Наконт цэнаўтварэння таксама даручэнне простае і яснае: для павышэння цэн сёння няма падстаў. Адпаведна, за гэтым патрэбны кантроль.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Парыж абвешчаны сталіцай летніх Алімпійскіх гульняў 2024 года




Летнія Алімпійскія гульні 2024 года пройдуць у Парыжы, а Лос-Анджэлес прыме Алімпіяду ў 2028 годзе, абвясціў Міжнародны алімпійскі камітэт на сесіі ў Ліме. На правядзенне Алімпійскіх гульняў таксама прэтэндавалі Гамбург, Будапешт і Рым, але ў канчатковы спіс яны не ўвайшлі. Дарэчы, і Парыж, і Лос-Анджэлес ужо двойчы станавіліся гаспадарамі Гульняў: Парыж прымаў Алімпіяды ў 1900-м і 1920 гадах, а Лос-Анджэлес — у 1932-м і 1984 гадах. А чарговыя летнія Алімпійскія гульні пройдуць у 2020 годзе ў Токіа.

### Больш за 130 тысяч расіян эвакуіравалі за два дні з-за званкоў пра бомбы

У Маскве званкі з пагрозамі аб «мініраванні» закранулі звыш 40 тысяч чалавек, расказала крыніца ў экстранных службах. Паводле яе слоў, ананімныя паведамленні датычыліся 50 аб'ектаў, у тым ліку вакзалаў і буйных гандлёвых цэнтраў. За два дні па ўсёй краіне з-за званкоў з пагрозамі эвакуіравалі звыш 130 тысяч чалавек з больш чым 420 аб'ектаў. Ні адно з паведамленняў не пацвердзілася. Адзін з самых першых выпадкаў быў зафіксаваны ў Омску 10 верасня, у адзіны дзень галасавання, калі эвакуіравалі членаў гарадской выбарчай камісіі. На наступны дзень званкі набылі масавы характар, а ў сераду іх хваля дабралася да Масквы.

### Венесуэла спрабуе адмовіцца ад долара пры разліках за нафту

Амерыканская газета The Wall Street Journal даведалася, што Венесуэла, імкнучыся абмежаваць уплыў амерыканскіх санкцый на эканоміку краіны, запатрабавала ад экспарцёраў нафты не весці разлікі ў доларах ЗША. Дасведчаныя крыніцы выдання расказалі, што нафтатрэйдары, якія працуюць з венесуэльскай нафтай, пачалі пераводзіць плацяжы ў еўра. Дзяржкампанія PdVSA папрасіла партнёраў па СП адкрыць рахункі ў еўрапейскай валюце. Афіцыйных паведамленняў пра адмову ад разлікаў у доларах не было. Дзяржаўная нафтавая кампанія Petroleos de Venezuela (PDVSA) і Міністэрства нафты Венесуэлы на запыты выдання не адказалі.

### Каля берагоў Мексікі сфарміраваўся трапічны шторм «Макс»

Каля паўднёва-заходняга ўзбярэжжа Мексікі сфарміраваўся ціхаакіянскі трапічны шторм «Макс». Пра гэта паведамляе Нацыянальны цэнтр ЗША па сачэнні за ўраганамі. Па звестках экспертаў, максімальная хуткасць ветру складае 65 кіламетраў у гадзіну. Раней каля берагоў Мексікі ўтварыўся ўраган «Кацця». Праз некалькі дзён шторм рассеяўся за 245 кіламетраў на поўдзень ад горада Тампіка.

## АНДРЭЙ ПАЎЛАВІЧ ХУДЫК



нарадзіўся ў 1959 годзе ў вёсцы Астраўчане Камянец-Падольскага раёна Хмяльніцкай вобласці Украіны.

У 1987 годзе скончыў Ленінградскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчы інстытут. У 2006 годзе — Расійскую акадэмію дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі (перападрыхтоўка).

Працоўную дзейнасць пачаў у 1977 годзе электраслесарам па рамонце электраабсталявання Камянец-Падольскага цэментнага завода.

З 1978 па 1980 год служыў у радах Савецкай Арміі.

Затым працаваў на розных пасадах на сельгаспрадпрыемствах Гродзенскай вобласці. У 1988—1999 гадах — старшыня калгаса імя Кірава Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці. У далейшым кіраваў Браслаўскім аграпрамысловым камбінатам у Віцебскай вобласці.

2001—2002 гады — першы намеснік старшыні — начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Ваўкавыскага райвыканкама Гродзенскай вобласці. З 2002 па 2011 год па чарзе ўзначальваў Дзятлаўскі і Лідскі райвыканкамы. 2011—2013 гады — намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама. З 2013 па 2014 год — старшыня Гродзенскага гарвыканкама.

З 2014 года да гэтага часу працаваў на пасадзе намесніка кіраўніка спраў Прэзідэнта Беларусі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Год навукі

# РАЗМОВА ПА СУТНАСЦІ

## На вяршыні вялікага айсберга...

**За 25 гадоў існавання Вышэйшай атэстацыйнай камісіі вучоная ступень доктара навук была прысуджана амаль 1600 саіскальнікам (сярэдні іх узрост складае 51 год). Ступень кандыдата навук атрымалі больш як 12 тысяч саіскальнікаў (сярэдні ўзрост — 34 гады). Акрамя таго, навуковую ступень ВАК прысудзіў 764 замежным грамадзянам: ступень доктара навук атрымалі 70 іншаземцаў і 694 — кандыдата навук. Гэтыя лічбы агучыў падчас Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Сістэма дзяржаўнай атэстацыі навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі» старшыня Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь доктар педагагічных навук, прафесар Генадзь ПАЛЬЧЫК.**

— Апошнія дзесяцігоддзе ў нас прасочваецца наступны трэнд: за год абараняюцца прыкладна 500 кандыдацкіх і каля 50 доктарскіх дысертацый. Многа гэта ці мала? Напэўна, сёння трэба ставіць пытанне пра актуальнасць даследаванняў, якія праводзяцца не толькі ў галіне тэхнічных навук і высокатэхналагічных спецыяльнасцяў, але і ў сферы гуманітарных навук, — яны сёння запатрабаваныя як ніколі, паколькі могуць сур'ёзна прааналізаваць новыя выклікі часу — іх негатыўны ўплыў на фарміраванне асобы і на ўсё наша грамадства, — падкрэсліў ён. — 25-гадовы юбілей ВАКа вельмі сімвалічна супаў з абвешчаным у Беларусі Годам навукі. Асаблівая ўвага з боку дзяржавы да навуковай сферы — гэта сур'ёзная адказнасць, а атэстацыя з'яўляецца вяршыняй вялікага айсберга падрыхтоўкі навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі...

**Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Максім РЫЖАНКОЎ** зачытаў прывітальны адрас Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі ўдзельнікам міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 25-годдзю Вышэйшай атэстацыйнай камісіі. У ім, у прыватнасці, адзначаецца, што падрыхтоўка і атэстацыя навуковых кадраў з'яўляецца неабходнай умовай інавацыйнага развіцця эканомікі і іншых сфер жыццядзейнасці грамадства. І роля ВАКа ў павышэнні прэстыжу і аўтарытэту беларускіх навукова-педагагічных школ, іх міжнародным прызнанні, адкрыцці новых імёнаў у навуцы — вельмі высокая. Кіраўнік дзяржавы перакананы, што абмен вопытам у гэтай сферы надасць магутны імпульс удасканаленню сістэмы дзяржаўнай атэстацыі навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

***(Падрабязнасці з навукова-практычнай канферэнцыі і круглага стала, прысвечанага ўдасканаленню нарматыўнай прававой базы сістэмы дзяржаўнай атэстацыі навуковых работнікаў, будуць апублікаваныя ў наступных нумарах «Звязды».)***

■

■ Парламенцкі дзённік

# У пошуку новых партнёраў

### Бізнес-форум краін Арганізацыі Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва пройдзе ў наступным годзе ў Мінску

**Аб гэтым заявіў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл МЯСНІКОВІЧ на сустрэчы з генеральным сакратаром Парламенцкай Асамблеі Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва (ПАЧЭС) Асафам ГАДЖЫЕВЫМ і намеснікам старшыні ПАЧЭС, старшынёй камісіі Народнага сходу Рэспублікі Балгарыя па эканамічнай палітыцы і турызме Петрам КЫНЕВЫМ.**

— Можа быць, мае сэнс гэты бізнес-форум прымеркаваць да Беларускага прамысловага форуму, які плануецца правесці ў маі наступнага года. Але не выключана, што гэта будзе самастойнае мерапрыемства, — адзначыў старшыня верхняй палаты беларускага парламента.

На думку Асафа Гаджыева, Беларусь, якая цяпер мае статус назіральніка ў арганізацыі, з'яўляецца адным з ключавых ігракоў аб'яднання. «Таму мы надаём важнае значэнне нашаму супрацоўніцтву, — адзначыў Асаф Гаджыеў. — Дарэчы, бізнес-форум будзе прымеркаваны да 25-годдзя стварэння арганізацыі. Прыблізна ў маі адбудзецца гэта мерапрыемства, пасля якога будзе праведзена канферэнцыя па Шаўковым шляху».

Што ж можа даць нашай краіне правядзенне бізнес-форуму? На яго думку, Беларусь гатова падзяліцца сваімі напрацоўкамі ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, акрамя таго, у краіне паспяхова развіваюцца турыстычныя напрамкі. «Гэтыя тры кампаненты робяць Беларусь вельмі прывабнай як для чарнаморскіх краін, так і для іншых, — дадаў генеральны сакратар. — Мэта бізнес-форуму — прадэманстраваць тое, што ёсць у Беларусі, а таксама ў нашым рэгіёне. Удзельнікамі форуму стануць бізнесмены з усіх краін — удзельніц арганізацыі, а таксама мы запросім краіны, якія носяць статус назіральнікаў».

Петр Кынеў паведаміў, што з 8 па 10 лістапада ў Беларусі пройдзе пасяджэнне міжурадкамісіі Беларусі і Балгарыі. «Я спадзяюся, што гэта будзе чарговы крок у развіцці нашых двухбаковых адносін», — сказаў Петр Кынеў.

Нагадаем, што Арганізацыя Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва была створана 25 чэрвеня 1992 года. У яе ўваходзяць 12 краін: Азербайджан, Албанія, Арменія, Балгарыя, Грузія, Грэцыя, Малдова, Расія, Румынія, Сербія, Турцыя і Украіна. Акрамя Беларусі, назіральнікамі ў арганізацыі з'яўляюцца Аўстрыя, Германія, Егіпет, ЗША, Ізраіль, Італія, Польшча і іншыя.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

■

# МУЗЕЙ ДРУКУ, ФЭСТ РЫЖЫХ І РАТАРУ

### У Гомелі заканчваюць падрыхтоўку да дня горада

**Графіці на адным з будынкаў па Савецкай вуліцы Гомеля — адзін з падарункаў, толькі што зроблены да дня горада і 875-й яго гадавіны.**




Гомельская гарадская арганізацыя БРСМ была натхняльнікам і спонсарам праекта насценнага роспісу. Першы сакратар гомельскай гарадской арганізацыі БРСМ Мікалай Святагор адзначае, што выява, якую зрабіў малады мастак Дзмітрый Казлюк, нагадвае гамяльчанам пра славутасці горада над Сожам і яго герб. Дарэчы, і гамяльчанкі Лаліта і Тамара Абдэль, якія толькі пабачылі новы твор стрыт-арту, з задавальненнем фатаграфуюцца на яго фоне і радуюцца, што многія з будынкаў набываюць непаўторнае аблічча.

Між тым напярэдадні асноўнага святкавання, 15 верасня, у горадзе над Сожам плануюць адкрыць музей друку. Намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага гарвыканкама Кацярына Дзегцярова расказала, што ён размесціцца ў тым жа будынку, дзе некалькі раней адкрыты музей фатаграфіі. Ініцыятарам выступіла абласная газета «Гомельская праўда», а экспазіцыю дапамаглі аформіць усе рэдакцыі газет Гомельшчыны. Вялізная аб'ёмная светлавая кампазіцыя «Я люблю Гомель» будзе змешчана на будынку «Белтэлекама» і стане яшчэ адным упрыгожваннем абласнога цэнтра на паўднёвым усходзе краіны.

Дэлегацыі з пятнаццаці гарадоў-пабрацімаў прыбудуць у Гомель напярэдадні. Чакаюць сёлета расіян, украінцаў, балгараў, сербаў, кітайцаў, грузін... Падчас сустрэч плануецца і падпісанне дакументаў аб супрацоўніцтве.

Больш за сотню разнастайных мерапрыемстваў адбудзецца 16 верасня. Частка горада стане пешаходнай. Шоу «Легенды старога ладчніка» адбудзецца вечарам 15 верасня ў Гомельскім дзяржаўным цырку, а 16-га павіншаваць Гомель з юбілеем прыедзе народная артыстка СССР Сафія Ратару, якая выступіць з канцэртам на стадыёне «Цэнтральны». Анатоль Ярмоленка, Герман, Ірына Дарафеева і больш за 500 мясцовых артыстаў чакаюць гледачоў у суботу на Гомельскай плошчы Леніна.

Арганізатары сёлета вырашылі разбіць Гомель на 12 тэматычных «гарадоў»: музычны, спартыўны, фестывальны, малады, кветкавы, прамысловы, транспартны, юбілейны, бяспечны, майстравы, друкаваны і гастранамічны. Так, напрыклад, «спартыўны» будзе прадстаўлены цірам, дзіцячым хакеем, работай фітнес-трэнераў. «Кветкавы» дасць магчымасць пазнаёміцца з дасягненнямі ландшафтнага дызайну. «Транспартны» пакажа экспазіцыю рарытэтнай тэхнікі. Каля двух кіламетраў набярэжнай ракі Сож будзе задзейнічана для розных забаўляльных пляцовак.

Да цікавінак, якія адбудуцца ў гэты дзень. Жыхары і госці Гомеля, якія маюць натуральны рыжы колер валасоў, атрымаюць зніжку на каву ў скверы імя Андрэя Грамыкі. Там адбудзецца музычна-тэатралізаваная дзея «Рыжы Гомель». Таксама гаражанам прапануецца прынесці з сабой аранжавыя ніткі, каб сумесна звязаць велізарны шалік. У гэтым жа скверы ўпершыню пройдзе і фэст «Вінаград Гомельшчыны». Тут жа адкрыюць і абноўлены фантан. Завяршальным акордам свята ў Гомелі стане феерверк, які будзе запушчаны з пяці кропак горада.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

## КАМПЕТЭНТНЫЯ АДКАЗЫ

**Ва ўсіх рэгіёнах краіны 16 верасня пройдуць рэгулярныя прамыя тэлефонныя лініі з уладамі. Некаторыя праблемы кіраўнікі вырашаюць не паклаўшы трубку тэлефона, іншыя бяруць пад уласны кантроль. Традыцыйна тэлефонныя лініі будуць працаваць з 9.00 да 12.00, на званкі адкажуць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Міхаіл Васілевіч ТОКАР (80162213121);

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС (80212222222);

першы намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Аляксандр Віктаравіч МІКАЛУЦКІ (80232751237);

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Віктар Андрэевіч ЛІСКОВІЧ (80152735644);

першы намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Алег Іванавіч ЧЫКІДА (80222501869);

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Алег Альфрэдавіч ПЛАЎСКІ (80175004160);

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Андрэй Віктаравіч ШОРАЦ (80172224444).

■ Надвор'е

# Грыбоў будзе хоць заваліся

### Сіноптыкі абяцаюць 17 і 18 верасня моцныя ліўні, ды і цёпла ўначы

**Так, сапраўды зараз багата ў кошыку пасля палявання па лесе. А далей будзе яшчэ больш. А ўсё таму, што дажджлівае надвор'е працягваецца і на гэтыя выхадныя, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

У пятніцу ў нас захаваецца няўстойлівае надвор'е, калі на тэрыторыі Беларусі будуць гаспадарыць атмасферныя франты і халодная паветраная маса. На большай частцы пройдуць кароткачасовыя дажджы. Днём у многіх раёнах чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Максімальная тэмпература паветра складзе плюс 13—19 градусаў. У першы дзень выхадных — у суботу надвор'е крыху палепшыцца. Стане сонечна, а ўвогуле будзе гаспадарыць зона павышанага атмасфернага ціску. Толькі ўдзень на паўднёва-заходняй частцы краіны адаб'ецца ўплыў франтальнага падзелу, які перамяшчаецца з паўднёвага захаду Еўропы. Уначы будзе без ападкаў, а ўдзень пераважна па паўднёва-заходняй частцы Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 6 да плюс 11 градусаў, удзень — 15—22 цяпла.

У нядзелю і панядзелак надвор'е ізноў сапсуецца. А прынясуць дажджы атмасферныя франты, якія перамяшчаюцца з паўднёвага захаду Еўропы. У нядзелю на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы, днём у асобных раёнах Брэсцкай і Мінскай абласцей чакаюцца моцныя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 9 да плюс 15 градусаў, удзень ізноў 15—22 цяпла. Па паўднёвым усходзе прагназуецца крышку цяплей: удзень будзе ад плюс 23 да плюс 28 градусаў.

Дрэннае надвор'е будзе і ў панядзелак. Тады на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, уначы ў асобных раёнах моцныя дажджы. Па паўночна-заходняй частцы Беларусі прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 10 да плюс 17 градусаў, а ўдзень 15—21 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

# Памежны баран,

### або Як мясцовыя жыхары праявілі пільнасць

**Афіцыйны прадстаўнік Брэсцкай пагранічнай групы Сяргей ДЗМІТРЫЕЎ паведаміў, што двойчы за тыдзень жыхары Брэста і раёна садзейнічалі вартавым мяжы ў папярэджанні спробы парушэнняў. Першы раз свядомыя грамадзяне затрымалі двух іранцаў, якія спрабавалі перасекчы мяжу ў абыход аўтадарожнага пункта пропуску «Брэст».**

Грамадзяне Ірана, якія імкнуліся трапіць у Германію, змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання, яны чакаюць дэпартацыі. А ў Брэсцкім раёне тым часам пагранічнікі затрымалі двух жыхароў Чачні, якія ездзілі па вёсках каля самай мяжы без адпаведных дакументаў. Пазней высветлілася, што названыя мужчыны з сем'ямі па паўтара дзясятка разоў выязджалі ў Польшчу спадзеючыся атрымаць там прытулак, але беспаспяхова... Яны і паказаліся вяскоўцам падазронымі, бо хадзілі ад хаты да хаты нібы ў пошуках барана, а барана не куплялі. Ураджэнцы Чачні таксама змешчаны ў ізалятар, дзе будуць чакаць рашэння па справе аб адміністрацыйным парушэнні.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню. Напачатку было Слова

# СВЯТЛО СКАРЫНЫ

**У міжнародным кангрэсе, прысвечаным юбілею беларускага кнігадрукавання, прымае ўдзел 600 дэлегатаў з 24 краін**










Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**ПРАДСТАЎНІКІ розных краін прымаюць удзел у Міжнародным кангрэсе «500 гадоў беларускага кнігадрукавання», які ўчора і сёння адбываецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Дзякуючы міністру замежных спраў Уладзіміру Макею і Надзвычайнаму і Паўнамоцнаму Паслу Беларусі ў Францыі Паўлу Латушку дзея праходзіць пад патранатам ЮНЕСКА.**

На ўрачыстым адкрыцці міжнароднага кангрэса **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Максім РЫЖАНКОЎ** адзначыў, што кніга з'яўляецца галоўнай крыніцай ведаў і рухаючай сілай у развіцці грамадства. Таксама ён павіншаваў прадстаўнікоў Нацыянальнай бібліятэкі з 95-годдзем іх установы і адзначыў, што яна працуе, захоўваючы для будучых пакаленняў багатую і духоўна насычаную спадчыну ўсяго беларускага народа. Максім Рыжанкоў зачытаў віншаванне кіраўніка краіны Аляксандра Лукашэнкі, дзе гаворыцца, што Нацыянальная бібліятэка па праве з'яўляецца галоўным цэнтрам асветы нашай дзяржавы.

— Сёння Нацыянальная бібліятэка паспяхова сумяшчае лепшыя традыцыі работы з чытачамі і найноўшыя тэхналогіі бібліятэчнай справы, — адзначыў **міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ**. — Радуюць поспехі па папулярызацыі чытання і трансляцыі духоўных каштоўнасцей. Вы з'яўляецеся неад'емным звяном усёй бібліятэчнай справы і заўсёды адкрыты для супрацоўніцтва.

Тое, што кніга па-ранейшаму займае важнае месца ў жыцці беларусаў, пацвердзіла і **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**:

— Гісторыя беларускай кнігі самым непасрэдным чынам звязана з сучасным кнігавыданнем. Традыцыі мінулых стагоддзяў, нязгаснае святло Францыска Скарыны з'яўляюцца для нас тым грунтам, на якім выбудоўваецца нацыянальнае кнігавыданне, тым фундаментам, што дапамагае ўмацоўваць суверэнную і незалежную Беларусь.

Каля 600 дэлегатаў з 24 краін, якія прысутнічаюць на кангрэсе, як адзначыў **дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман МАТУЛЬСКІ**, — гэта вядомыя грамадскія і палітычныя дзеячы, дыпламаты, кіраўнікі і аўтарытэтныя спецыялісты навуковых, навучальных і культурных устаноў з Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Балгарыі, Вялікабрытаніі, Германіі, Кітая, Польшчы, Расіі, Украіны, Чарнагорыі і іншых краін.

У Нацыянальнай бібліятэцы распачала работу і унікальная міжнародная выстава «Францыск Скарына і яго эпоха». Там можна ўбачыць арыгіналы і факсіміле першадрукаў XV — XVII стагоддзяў, прывезеныя з іншых краін. З Германіі, напрыклад, даставілена 42-радковая Біблія Іагана Гутэнберга 1450-х гадоў. Цэнтральнае месца адведзена арыгінальным выданням Францыска Скарыны з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, якія ўбачылі свет у Празе і Вільні ў 1517—1525 гадах. Выстава будзе працаваць да 31 снежня.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

■ Белая вежа — 2017

# КАЛІ Б НЕ БЫЛО НЯНАВІСЦІ І ЗЛОСЦІ...

## Маскоўскі тэатр юнага гледача стаў падзеяй фэсту

**Як і чакалася, спектакль «Скрыпка Ротшыльда» Маскоўскага ТЮГа прайшоў пры поўным аншлагу. Нам падарылі асалоду ад сапраўднага тэатра. Названая работа — трэцяя частка трылогіі рэжысёра Камы Гінкаса «Жыццё цудоўнае», якая пастаўлена па творах Чэхава. Першыя дзве — «Чорны манах» і «Дама з сабачкам» — трывала ўвайшлі ў рэпертуар тэатра. А гісторыя трунара Якава, які пражыў жыццё ў суседстве са смерцю, расказана проста, пранізліва і, разам з тым, страшна.**

Трунара з правінцыяльнага горада прырода надзяліла сілай, талентам і чалавечымі пачуццямі. Але Якаў даўно пахаваў у сабе ўсё добрае, толькі крыўдзіўся на землякоў, што паміраюць рэдка і мала, таму ён пастаянна церпіць страты. І без канца лічыў, лічыў, лічыў капейкі і нічога больш не заўважаў. Не бачыў, як пакутуе побач з ім жонка, як растуць дрэвы на рацэ яго юнацтва. Ён нібы выкараніў з сябе ўсё чалавечае, нават сцёр са свядомасці памяць пра сваю адзіную дачку, якая памерла немаўляткам. А яшчэ ён пастаянна крыўдзіў і прыніжаў яўрэя-музыканта Ротшыльда, на ім зганяў усю сваю злосць і душэўнае чарноцце. Якаў у выкананні народнага артыста Расіі Валерыя Барынава ўвесь час знаходзіцца ў канфлікце з самім сабой. А церпіць ад гэтага няшчасны Ротшыльд (народны артыст Расіі Ігар Ясуловіч). І хоць сучасны глядач прывык часта бачыць гэтых акцёраў у серыялах, талент свой яны, да іх гонару, не растрацілі.

Менавіта магутная іх ігра дазволіла адчуць гледачу паступовы прарыў трунара Якава да сваёй чалавечай існасці. Душа яго адхіснулася ад трун, побач з якімі ён правёў жыццё, толькі калі памерла жонка. Ужо ў апошнія яе дні той, хто ні разу не сказаў ёй ласкавага слова за жыццё, спрабаваў яе ўратаваць, павёз у бальніцу, купіў лекі. Але было позна. Марфа адышла ў іншы свет з радасцю, што пазбаўляецца ад такога нешчаслівага жыцця. А ён пасля гэтага не пражыў і двух дзён. «Можа, гэта і ёсць каханне?» — няўпэўнена дапусціў адзін з крытыкаў спектакля.

Можа і так. Бо за гэтыя два дні персанаж Валерыя Барынава змог усвядоміць страшэнную пустэчу свайго жыцця. І дапамагла яму жонка. Яна стала прыходзіць да яго ў снах, расказвала пра раку і вярбу іх маладосці, пра маленькае дзіцятка, якому яны спявалі песні паўвека таму. У снах заклікала яго кінуць труны, зрабіць лодку і плаваць ад сядзібы да сядзібы, іграць на скрыпцы для людзей. Ён жа так добра іграў на сваёй любімай скрыпцы...

Герой раптам усведамляе, што прапала жыццё. І, о цуд: гэты драўляны цурбан у вобразе чалавека пачынае гаварыць чэхаўскімі словамі: «Вось каб не было нянавісці і злосці, людзі мелі б адзін ад аднаго велізарную карысць. Навошта людзі наогул перашкаджаюць жыць адно аднаму?» Ён перажывае адраджэнне, бо пачынае шкадаваць, што крыўдзіў жонку, што біў і прыніжаў Ротшыльда. І ў рэшце рэшт завяшчае сваю скрыпку таму самаму Ротшыльду.




Фота Валерыя КАРАТАЯ.

**Рыжскі рускі тэатр, сцэна са спектакля «Альбом».**

Трэба сказаць, што рэжысёр вельмі беражліва абышоўся з тэкстам Антона Чэхава. Героі чытаюць апавяданне фактычна слова ў слова і разам з тым перадаюць вядомы сваёй няўлоўнасцю чэхаўскі стыль. Народныя артысты сыгралі бліскуча. Але несправядліва было б не сказаць пра заслужаную артыстку Арыну Несцераву. Яна стварыла Марфу, на першы погляд, забітую, няшчасную, бязвольную, але такую, якая, як і ўсялякая сапраўдная жанчына, змагла кіраваць усім, нават пасля сваёй смерці.

Колькі слоў варта сказаць пра яшчэ адну чаканую пастаноўку фестывалю — спектакль «Альбом» Рыжскага рускага тэатра імя Чэхава. (Антон Паўлавіч на гэтай «Вежы» прысутнічаў у многіх іпастасях. — ***Аўт.***) Тэатр добра вядомы брэсцкаму гледачу: у 2001 годзе яны ўзялі Гран-пры, два гады таму пастаноўкай «Фро» паводле Андрэя Платонава выклікалі сапраўдны фурор. Дык вось сёлетнюю работу крытыкі разбілі ледзь не ўшчэнт. Відаць, з прафесійнымі экспертамі можна пагадзіцца ў тым, што дзеі не хапіла пэўнай дынамікі і цэласнасці. Але ж і жанр яны выбралі такі, спектакль складаецца з сямі розных сюжэтаў-аповедаў паводле кароткіх навел Аркадзя Аверчанкі.

Спакушэнне. Здрада. Каханне. Расплата. Расказанае аўтарам сто гадоў таму актуальна і цяпер. Падзагаловак альбома «Сем спосабаў спакусы» абяцаў гучныя любоўныя гісторыі. Так яно і было. Зала смяялася і спачувала, а таксама ўважліва слухала вядучага ў ролі Лёсу. Людзі думаюць, што яны гаспадары жыцця і сітуацый, а насамрэч усёмагутны Лёс валодае ключамі ад падзей, поспеху альбо правалу нават у каханні. Артысты лёгка пераўвасабляліся ў персанажаў іншага апавядання і надзвычай пранікнёна ігралі.

Парадавалі «Белую вежу» і некаторыя беларускія тэатры. Але пра гэта — у наступных фестывальных нататках.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

ЗВЯЗДА
НАПЕРАД У МІНУЛАЕ
Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# НА ВЯСЕЛЛЕ Ў АЎЦЮКІ

## А вы можаце з'есці яечню з сарака яек?

**Разам з камандай праекта «Наперад у мінулае», што выходзіць па нядзелях у эфіры тэлеканала «Беларусь 3», традыцыйна вандруе і наш карэспандэнт. На працягу верасня выпускі праграмы расказваюць, як на Асіповіччыне, Калінкавіччыне ды ў Ельскім раёне спрадвек адзначалі вяселле і дажынкі. Часта ў жыцці беларусаў гэтыя ўрачыстасці суседнічалі і прыпадалі на канец лета — пачатак восені. Сёння згадваем самыя яркія моманты з гэтых вандровак.**



Гаспадары хлебам-соллю вітаюць жней, якія вярнуліся з поля.

### Каласок і Калінка запрашаюць

На ўездзе ў сталіцу гумару, знакамітыя Вялікія Аўцюкі, што на Калінкавіччыне, вас прывітаюць Каласок і Калінка. Калінка — так мясцовыя жыхары называюць жонку — мажная жанчына, Каласок — муж — худзенькі мужчынка з чаркай у руках. У Аўцюках любяць пажартаваць, таму тлумачаць, што Каласок не вырас высокі, бо надта любіць хмельныя напоі.

Звычайна шмат гасцей сюды прыязджае на фестываль гумару, які праходзіць на скрыжаванні дарог паміж Вялікімі і Малымі Аўцюкамі. Тут гучаць частушкі, жарты, смешныя гісторыі з жыцця. Удзельнічаюць і прадстаўнікі мясцовай улады. Неяк паводле сюжэта кіраўнікі сельвыканкамаў пасварыліся і знайшлі паразуменне толькі на спецыяльна ўстаноўленай да свята «лаве прымірэння». Дарэчы, і сёння на ёй могуць пагодзіцца тыя, хто нешта не падзяліў.

Нас жа запрасілі на вяселле, якое паводле старажытных традыцый ладзіць мясцовы фальклорны калектыў.

Спявачкі расказалі, што раней вяселлі ў Аўцюках спраўлялі толькі ў мясаед, у пост ніколі не рабілі. Найбольш спрыяльныя часы — Каляды, пасля Вялікадня і летам — пасля Пятроўкі і Спасаўкі. Спачатку жаніх з сям'ёй ішлі ў сваты да маладой, а назаўтра адзначалі змовіны: дарылі падарункі самым родным. На змовіны запрашалі і сяброўак маладой. Існаваў адметны звычай. Пакольскі дзяўчатам было шкада адпускаць сяброўку ў іншае жыццё, то яны раптоўна прыходзілі да сватоў з талеркай і пустой бутэлькай і казалі: «Наша маладая вялікая, а бутэлечка — маленькая. Налівайце, каб была нам паўненькая».

### Дзе сапраўдныя, а дзе — падробныя?

Вяселле тут святкавалі тры дні. Пачыналася свята ў хаце маладой. Усе госці жаніха — баяры і нявесты — баяркі збіраліся разам. Спявалі такую песню:

*Замкні-замкні мяне,*
*мамка, у каморы,*
*Каб не ўзялі тыя госцікі*
*нас з сабою.*
*Ці я цябе, мая донька,*
*гадавала,*
*Каб я цябе ў каморы*
*замыкала?*
*Я цяпер, мамка, не гарую,*
*Што ты аддаеш мяне*
*замуж маладую*
*Ды купі мне зязюленьку*
*лугавую.*
*Лугавая зязюленька*
*будзе кукаваць*
*І будзе мяне, маладую,*
*пабуждаць.*
*Бо чужая мамка*
*не пабудзіць,*
*Толькі выйдзе на вуліцу*
*ды пасудзіць.*

Калі прыходзілі баяры ў хату, абносілі стол караваямі (ад сям'і маладога і маладой) тры разы, спаборнічаючы, «чый каравай вышай». Але перад тым, як госці заходзілі ў хату і сядалі за стол, бацькам трэба было «знесці свечкі» — як сімвал новай сям'і. Спявалі пры гэтым песню з такімі словамі: «Прыступі, сваха, да мяне, і ў цябе свяца, і ў мяне, і ў цябе дзіця, і ў мяне...».

Другі дзень вяселля святкавалі ў маладога. Тут замужняя жанчына і заставалася начаваць. Сімвалічнай песняй «Заграбай, мамка, жар-жар» яна развітвалася з роднай сям'ёй і пераходзіла ў новую. Пасля таго як вясельны каравай быў падзелены, гулялі ў «запарожцаў». Два мужчыны станавіліся спінай адзін да аднаго, іх звязвалі посцілкай. Так атрымліваўся «конь», на які сядаў «запарожац». Запарожца трэба было пачаставаць і адарыць з усіх бакоў.

**Пад упрыгожаную бараду клалі хлеб і соль — як ахвяры духам ніўкі, каласкі крыху прыкопвалі зямлёй — каб духам было ўтульна зімаваць і яны паспрыялі налета ўрадлівасці поля і багаццю ўраджаю.**

На трэці дзень былі ўжо так званыя пярэзвы: сваякі і сяброўкі нявесты ішлі ў госці да маладажонаў, каб праверыць, ці добра да дзяўчыны ставяцца, ці прынялі яе ў новую сям'ю. Тут цешча прaвярала зяця, пякла яечню з сарака яек і загадвала яе з'есці. Дапамагаць яму маглі і сябры. Жартавалі і з маладых: аднавяскоўцы часам прыводзілі пару «падробных» маладажонаў, вельмі няшчасную жонку, якая ўжо паспела нарадзіць уяўнае дзіця і зацяжарыць яшчэ адным, і змучанага мужа. А вясёлая бяседа павінна была паказаць, што тыя малады і напраўду «падробныя».



Свечкі, якія сімвалічна зносяць бацькі, упрыгожваюць стужкамі, кветкамі і гронкамі рабін.



Гурт народнай песні ў Вялікіх Аўцюках правядзе вяселле паводле старажытных традыцый.

### «Ніўка-ніўка, аддай нашу сілку...»

А вось на Асіповіччыне нас пазнаёмілі з адметнасцямі тутэйшых дажынак. Аднавіць старажытны абрад калектыву народнай песні «Вяселле», які створаны пры Каўгарскім сельскім клубе, дапамаглі мясцовыя носьбіты традыцый. Яны ж перадалі маладзейшым і песні, што спрадвек спявалі, завяршаючы жніво, і замовы, якія нібыта гарантавалі захаванне сёлетняга і багацце наступнага ўраджаю.

З апошніх зжатых каласкоў у полі складалі апошні дажыначны сноп. Яго старэйшыя жней перадавалі маладзейшай, а потым дарылі гаспадару. Апошні сноп трэба было захоўваць на покуці да наступнага ўраджаю. Некалькі каласоў пакідалі нязжатымі. Іх упрыгожвалі стужкамі і завівалі так званую бараду. Пад упрыгожаную бараду клалі хлеб і соль — як ахвяры духам ніўкі, каласкі крыху прыкопвалі зямлёй — каб духам было ўтульна зімаваць і яны паспрыялі налета ўрадлівасці поля і багаццю ўраджаю.

Правёўшы такі рытуал, жнеі качаліся па зжатай ніве, прыгаворваючы: «Ніўка-ніўка, аддай нашу сілку, дай Божа другое лета даждаці, гусцейшае, каранейшае жыта жаці».

Вяртаючыся са жніва ў вёску, да гаспадара поля, жнеі спявалі такую песню:

*А ў нас сёння вайна была,*
*Мы ўсё поле звajвалі,*
*Усё жыта дажыналі,*
*Сноп апошні дажалі.*
*У ваш двор*
*шырокі прынеслі.*
*Прымі, гаспадар,*
*дажыначны сноп.*

Вітаючы жней на парозе дома, гаспадар мусіць іх пачаставаць, прывітаць хлебам-соллю. Сімвалічным быў абрад выкупу снапа — так працаўніцы атрымлівалі грашовую ўзнагароду за жніво. А пачастунак за сталом і бяседа з песнямі і танцамі, якія доўжыліся ледзь не да раніцы, адзначалі завяршэнне важнай працы і служылі добрым адпачынкам.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

## «СМАК ЖЫЦЦЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»

**Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або II паўгоддзе 2017 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 9 кастрычніка 2017 года ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.**

**Сярод падпісчыкаў 12.10.2017 года будуць разыграны 7 вяндлярняў электрычных «ТэрмМікс» і суперпрыз — Маразільнік Indesit. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 22.10.2017 года.**

**Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31.12.2017 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2017 года і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Смак жыцця са «Звяздой» чытайце ў нумары 171 газеты «Звязда» ад 06.09.2017 года.**

**Тэлефон для даведак (017) 337 44 04.**

**Тэрмін правядзення гульні — з 7.09.2017 да 31.12.2017.**

**Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №3087 ад 04.09.2017 года выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.**



МАРАЗІЛЬНІК Indesit SFR 100



Вяндлярня электрычная суцэльнаметалічная «ТэрмМікс»

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або II паўгоддзе 2017 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______________________

______________________

**Падпіска афармлена і аплачана ў** ______________________
(аддзяленне сувязі)
**на IV квартал або II паўгоддзе 2017 года**

**Хатні адрас і тэлефон** (абавязкова) ________ (індэкс) ________

______________________

______________________

**Удачы ў розыгрышы!**



**ПАЕХАЛІ!**
**«ПРЫГОДЫ ПРЫНЦА ФЛАРЫЗЕЛЯ»**
**МІР, 23 верасня ў 10.40 і 23.55**



Трохсерыйны прыгодніцка-іранічны дэтэктыў, зняты паводле твораў Р. Л. Стывенсана (так-так, аўтара знакамітага «Вострава скарбаў»), выйшаў на экраны ў 1981 годзе. Майстэрства рэжысёра Яўгена Татарскага і бліскучага акцёрскага ансамбля — Алег Даль, Данатас Баніёніс, Ігар Дзмітрыеў і многія іншыя — ператварылі пародыю на авантюрны жанр у самастойны мастацкі твор.

Кіраўнік невялічкай дзяржавы Бакардзії прынц Фларызель нудзіцца настолькі, што выпраўляецца ў падарожжа з мэтай развеяцца. Аднойчы ён выратоўвае маладога мастака, які збіраўся скончыць жыццё самагубствам, і дзякуючы гэтаму даведваецца пра загадкавы «Клуб самазабойцаў», якім кіруе нейкі Старшыня...

**«НА НАЖАХ»**
**«Беларусь 2», шточацвер у 13.05 і 20.55**




Гэты праект — умоўна кажучы, яшчэ адна бульбіна ў вялізны чыгун кулінарных праграм. Праўда, дзеля разнастайнасці стваральнікі расійскага рэаліці-шоу выйшлі з утульнай кухні-студыі і накіраваліся напрасткі ў глыбінку — па стратных кафэ і рэстаранах правінцыйных гарадоў.

Экзамен на прафпрыдатнасць мясцовыя работнікі грамадскага харчавання здаюць не каму-небудзь, а кулінарнаму гуру — вядомаму рэстаратару, шэф-повару з 20-гадовым стажам Канстанціну Іўлеву. Яго ж задача — выправіць халатнасць, нядбайнасць і неадукаванасць персаналу і за месяц з дапамогай шокавай тэрапіі, цяжкай рукі і памкнення да дасканаласці ператварыць стратныя рэстараны ў прыстойныя і папулярныя месцы. Хто з рэстаратараў рызыкне прыняць жорсткія правілы гульні шэф-майстра і чым гэта ўсё скончыцца?

**«ХАРЧОВАЯ ФАБРЫКА»**
**Discovery Channel, штодня па буднях у 9.30, 15.00, 21.00 і 6.20**




Вы ўпэўнены, што кансервы фабрычнай вытворчасці шкодныя, а крупы або ёгурты — карысныя? Канадскія тэлевізійнікі дазволілі сабе засумнявацца ў быццам бы відавочных рэчах і знялі маштабны дакументальны серыял «Харчовая фабрыка», які вось ужо 6 сезонаў з поспехам ідзе ў розных краінах свету.

